Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 31 (273) | Аўторак, 20 лістапада 1956 года | Цана 20 кап.

КАЛІ ТАБЕ—КОМСАМОЛЕЦ ІМЯ...

Комсамолец... Член вялікай сям'і перадавога авангарда савецкай моладзі, смелых і энергічных людзей, якім па плячу любая, нават самая цяжкая справа. Легендарнай славай авеяна гэтае імя. Бясприкладная мужнасць і самаадданы гераізм у жорсткіх баях супроць ворагаў нашай Радзімы у час грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, кіпучы энтузіязм і смелае дзярзанне у рабоце па аднаўленню нашай Радзімы, умацаванню яе эканамічнай і палітычнай магутнасці, пакарэнне векавой, не кранутай чалавекам цаліны і аблогаў — такі шлях комсамола ад часу яго стварэння і да нашых дзён.

Шчырая адданасць Комуністычнай партыі і савецкай Радзіме, крышталь ная сумленнасць, гарачы патрыятызм і комуністычная свядомасць — вось што характарызуе кожнага сапраўднага комсамольца. Комуністычны саюз моладзі носіць імя вялікага Леніна. Гэтым павінен ганарыцца кожны комсамолец. Слаўныя традыцыі комсамола гавораць аб тым, што моладзь нашай краіны ва ўсіх сваіх справах заўсёды імкнецца быць падобнай Ільічу, выконваць яго запаветы. Усёй краіне вядомы неўміручыя імёны комсамольцаў—герояў грамадзянскай вайны, Айчыннай вайны, Герояў Соцыялістычнай Працы.

Багаты традыцыі комсамола Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Колькі вядомых вучоных, выдатных пісьменнікаў, дзеячоў мастацтва, а таксама грамадскіх дзеячоў сумленна працуюць на карысць нашай Радзіме! Яны выхоўваліся у калектыве комсамольцаў нашага універсітэта.

Адна з яскравых рыс перадавой моладзі—гэта тое, што комсамол не палохаецца цяжкасцей. Наадварот, ён заўсёды ідзе насустрач ім і заўсёды пераадольвае іх. Падыйдзіце у час размеркавання да пакояў рэктарата і вы пачуеце, як комсамольцы-выпускнікі з гарачым сэрцам імкнуцца працаваць там, дзе найбольш цяжка, ехаць туды, куды пасылае Радзіма і Комуністычная партыя.

Большасць комсамольцаў, якія прыйшлі ва універсітэт, выдатна вучацца, настойліва авалодваюць ведамі, імкнуцца быць поўнацэннымі спецыялістамі. Такія комсамольцы ўмеюць берагчы час і не толькі добра вучацца, але і выконваюць грамадскія даручэнні. Студэнты А. Хоміч (V курс геолага - геаграфічнага факультэта), Е. Клімаў (III курс філфака), Н. Цярнігор'ева (IV курс аддзялення фізікі), В. Аляхновіч (IV курс біёлага-глебавага факультэта), Т. М'шурная (III курс філалагічнага факультэта) з'яўляюцца гордасцю універсітэцкага комсамольскага калектыву. Кіруючыся лепшым традыцыямі комсамола універсітэта, каля трохсот студэнтаў паехалі летам гэтага года у далёкі Казахстан на дапамогу навасёлам цаліны ва ўборцы ураджаю.

Імя комсамолец да многага абавязвае. Але-ж ці усе з комсамольцаў ведаюць аб сваіх абавязках, ці усе даражаць іменем комсамольца? Нядаўна комсамольскі патруль затрымаў у адным з рэстаранаў студэнта II курса геолага-геаграфічнага факультэта Міхаіла Скакуна. Гэты комсамолец, напіўшыся п'яным, паказваў верх майстэрства у стыльных танцах. Калі яго папярэдзілі, што такія танцы не робяць гонару комсамольцу і што, наогул, рэстаран не месца для студэнта, то Скакун толькі пагардліва павёў плячыма. І гэта робіць студэнт, які належыць да баявога комсамольскага калектыву!.

Быць комсамольцам—гэта не толькі рэгулярна плаціць членскія узносы, прысутнічаць на сходах, насіць пры сабе комсамольскі білет і нагрудны значок. Хаця многія комсамольцы нават і аб гэтым забываюць. Прыгляджуся да студэнтаў нашага універсітэта і вы рэдка ў каго убачыце на грудзях комсамольскі значок. І ніхто з кіруючых таварышаў не звяртае на гэта увагі: ат, дробязі!..

На IV курсе хімічнага факультэта сакратар комсамольскага бюро Ігар Пакроўскі сем разоў прасіў студэнтаў сваёй арганізацыі прыйсці комсамольскія білеты, бо у іх амаль за поўгода няма адзнакі аб уплаце узносаў. Хіба гэта таксама дробязі? Не, усё гэта вельмі сур'ёзная справа. З такіх «дробязей» складваецца характар чалавека, выхоўваецца яго воля і здольнасць да працы.

Даўно пара ўжо гнаць з універсітэта закарэлую абывацельшчыну і мяшчанства. Ва універсітэце работа комсамольскай арганізацыі павінна быць пастаўлена так, каб кожны комсамолец адчуваў сябе сапраўды членам вялікай сям'і і заўсёды ганарыўся гэтым.

5 лістапада ў жыцці комсамола нашай краіны адбылася важная і радасная падзея: партыя узнагародзіла ВЛКСМ ордэнам Леніна. Пятая узнагарода сведчыць аб тым, што комсамол нашай краіны з гонарам выконвае заданні Комуністычнай партыі. Гэта патрабуе ад членаў комсамола яшчэ лепш працаваць, умацоўваць свае рады і адкідваць усё тое, што перашкаджае нам на светлым шляху да комуністычнага заўтра.

НА ЗДЫМКУ: студэнты 3-га курса фізіка-матэматычнага факультэта Іван Лукашын і Генадзій Бабок вывучаюць электронны генератар высокай частаты.

Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

ЦІКАВЫ ДАКЛАД

Днямі рэктар універсітэта прафесар К. І. Лукашоу прачытаў цікавы даклад, прысвечаны 20-му міжнароднаму геалагічнаму кангрэсу, які праходзіў у Мексіцы у верасні гэтага года. На кангрэсе прафесар К. І. Лукашоў прысутнічаў у якасці дэлегата ад Акадэміі навук Беларускай ССР.

Спачатку дакладчык азнаёміў слухачоў з парадкам правядзення кангрэса і пытаннямі, якія выраш аліся на ім. Міжнародныя кангрэсы склікаюцца праз кожныя чатыры гады. Мінулы раз ён праходзіў у Алжыры, у 1960 годзе адбудзецца у Капенгагене.

У гэтым годзе на кангрэсе ў складзе дэлегацыі Совецкага Саюза знаходзілася звыш 60 чалавек. Усяго на кангрэсе было 1500 удзельнікаў. Мэта кангрэсу заключалася у тым, каб падвесці вынікі даследавання ў галіне геалогіі вучонымі свету. На кангрэсе працавала 16 секцый і 5 семінараў па асобных спецыяльных пытаннях. Было заслухана больш 500 дакладаў, з якіх 60 было прадстаўлена дэлегацыяй Совецкага Саюза.

Да совецкай геалогіі і геолагаў усе адносілся з вялікай павагай. Выстаўка геалагічных карт і кніг арганізаваная геолагамі СССР выклікала вялікую цікавасць сярод дэлегатаў.

Дакладчык сказаў, што совецкія вучоныя вельмі задаволены вынікамі кангрэсу. Ён дапамог высветліць рад пытанняў і садзейнічаў наладжванню кантакта паміж вучонымі Совецкага Саюза і іншых краін.

Пасля пасяджэння сесіі кангрэсу была арганізавана геалагічная экскурсія у пауднёвую частку Мексікі, у якой удзельнікаў і К. І. Лукашоу. Экскурсія дапамагла лепш азнаёміцца з жыццём народа, з яго звычаямі. Дакладчык расказаў аб эканоміцы Мексікі, аб яе нацыянальных рэсурсах, аб становішчы простага народа, яго культуры і быце.

Даклад К. І. Лукашова ілюстраваўся паказам геаграфічных і эканамічных карт, а таксама фотаздымкамі праз эпідыяскоп.

А. СІЛЯНКОЎ,
В. ЧЭПІКАЎ.

Партыйнае жыццё

Актывізаваць работу комуністаў

Адбыўся справаздачна-выбарчы партыйны сход філалагічнага факультэта. Дакладчык—сакратар партарганізацыі С. Я. Янчанка і выступіўшыя ў спрэчках гаварылі аб вялікай рабоце, якую правёў калектыў факультэта за справаздачны перыяд. У аснову дзейнасці былі пакладзены гістарычныя рашэнні XX з'езда КПСС.

Вялікая група студэнтаў-філолагаў вызваджала па закліку ЦК ВЛКСМ на цалінныя землі, астатнія працавалі у калгасах Мінскай вобласці на уборцы ураджаю. Нядрэнныя вынікі і у вучобе. З сямісот пяцідзесяці студэнтаў, трымаўшых экзамены ў зімовую сесію 1955—56 г. 274 здалі на «выдатна» і 403—на «добра» і «выдатна». Комуністы Каленчык, Клімаў, Зімак і другія з'яўляюцца выдатнікамі вучобы.

Аднак у рабоце партыйнай арганізацыі было і многа недахопаў.

Справядліваю крытыцы на сходзе былі падвергнуты многія выкладчыкі, якія мала цікавіліся жыццём студэнтаў. У прыватнасці, комуністы крытыкавалі С. Л. Дорскага, Н. Г. Багалюбаву, В. М. Цімафееву за дрэнную работу у групах, за якімі яны замацаваны.

Комуніст М. Е. Цікоцкі не здолеў наладзіць рэгулярны выпуск газеты «Журналіст». Не выканаў некалькі даручэнняў загадчык кафедры друку комуніст М. С. Зярніцкі. Асабліва рэзкі папрок быў зроблен у адрас комуніста Л. Абушэнкі, які не змог наладзіць работу профсаюзнай арганізацыі аддзялення журналістыкі. На пасяджэнні бюро груба, нетактычна і, па сутнасці, стаў на шлях падману партыйнай арганізацыі. У выніку на факультэце былі выпадкі грубага парушэння дысцыпліны, амаральныя учынкі з боку некаторых студэнтаў. Не забыліся яшчэ справы Курчэўскага, Рожына, Шаціла, Чымірка, Георгіева.

Вялікага папроку заслугоўваюць комуністы IV курса аддзялення журналістыкі Ткачук, Марчанка, Кац, Пільшчыкаў. Выконваючы адказныя даручэнні, яны зусім забылі аб сваім курсе. На курсе дрэнная дысцыпліна, вельмі многа пропускаў заняткаў.

Недастаткова ўвагі ўдзяляла партыйнае бюро рабоце з аспірантамі. Чым як не дрэнным кіраўніцтвам з боку партыйнага бюро можна растлумачыць выпадак з былым аспірантам А. Мажэйка? Хоць партыйнае бюро і абмяркоўвала пытанне аб падрыхтоўцы аспірантаў, у прыватнасці, паводзіны А. Мажэйка, але было ўжо даволі позна.

Комуністы указалі на рад недахопаў ва учэбнай рабоце. Некаторыя выкладчыкі працягваюць чытаць лекцыі на нізкім навукова-педагагічным узроўні, за што рэзкай крытыцы на старонках газеты «Звязда» была падвергнута дацэнт В. М. Цімафеева.

Запушчана таксама навукова-даследчая работа студэнтаў. А гурток журналістыкі (кіраўнік дацэнт М. С. Зярніцкі) і рускай мовы (кіраўнік дацэнт А. Я. Бірала) зусім не працуюць.

Усё гэта гаворыць за тое, што партыйнае бюро не здолела мабілізаваць усіх комуністаў на выкананне пастаўленых задач.

Член КПСС В. А. Захарава ў сваім выступленні правільна адзначыла, што члены бюро, у прыватнасці, С. Я Янчанка і Н. Паўленка, заўсёды заняты. Але калі тав. Янчанка апраўдваецца тым, што ён многа работы імкнуўся зрабіць асабіста і таму не прыцягваў да гэтага комуністаў, то тав. Пауленка наогул мала увагі удзяляў партыйнай рабоце. Больш за усё ён быў заняты сваімі асабістымі справамі.

Выступаўшыя адзначылі і іншыя недахопы у дзейнасці партыйнага бюро. Напрыклад, яно мала цікавілася жыллёва-бытавымі умовамі студэнтаў.

У спрэчках выступіла 8 комуністаў. Партыйны сход быў вельмі здзіўлены тым фактам, што ніхто з комуністаў аддзялення журналістыкі не выступіў, нягледзячы на тое, што аб недахопах гэтага аддзялення гаварылася многа. Сход абраў новы састаў бюро, куды увайшлі І. В. Гутарау, І. Я. Навменка, З. О. Зімак, Д. Е. Фактарэвіч, Н. Я. Сакалоуская, Н. Лук'янцава.

М. БАРАВЫ.

Нарада курсавых комсамольскіх бюро

Нядаўна комсамольскае бюро філалагічнага факультэта правяло нараду членаў курсавых комсамольскіх бюро.

Комсорг II курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры т. Заяц расказаў аб сваім плане работы. Комсоргі даведаліся таксама аб плане работы IV курса аддзялення журналістыкі. Акрамя таго, яны абмеркавалі прапанаваны план работы факультэцкага бюро.

Намеснік сакратара бюро факультэта т. Круглоу растлумачыў, як трэба праводзіць улік, а таксама спыніўся на арганізацыйнай рабоце на курсе.

Такая нарада прынесла многа карысці комсоргам курсаў. Былі выказаны пажаданні, каб падобныя нарады праводзіліся сістэматычна.

Новы склад камітэта ЛКСМБ універсітэта

ЦК ВЛКСМ пастанавіў прадаставіць правы райкома пасобным камітэтам комсамола, дзе налічваецца вялікая колькасць комсамольцаў. Зыходзячы з гэтага і кіруючыся рэкамендацыяй ЦК ЛКСМБ, комсамольская канферэнцыя універсітэта абрала у гэтым годзе склад камітэта комсамола з 45 членаў з мэтай прыцягнуць больш шырокі актыў комсамольцаў да грамадскай работы. Камітэт комсамола абраў бюро з 11 членаў:

І. Е. Бабосаў, сакратар

2. Н. Рожын, намеснік сакратара па арганізацыйнай рабоце і уліку.

3. І. Кісялёва, намеснік сакратара па палітыка-выхаваўчай рабоце.

4. Э. Тачыцкі, адказны за вытворча-акадэмічную работу.

5. П. Науменкаў, адказны за навукова-даследчую работу.

6. І. Чыкілеўская, адказная за культурна-масавую работу.

7. Л. Маліноўская, адказная за шэфскую работу.

8. В. Паўловіч, адказны за абаронна-спартыўную работу.

9. А. Яскевіч, адказны за друк.

10. Д. Сіроцін, адказны за работу ініцыятыўных груп.

11. В. Ізох, адказны за жыллёва-бытавы сектар.

Комсамольцы АБМЯРКОЎВАЮЦЬ сваю РАБОТУ

САМАСТОЙНА АВАЛОДВАЦЬ НАВУКАЙ

(З выступлення прарэктара па навуковай рабоце Г. А. Павецьева)

Выступаючыя таварышы гаварылі аб самастойнай вучобе студэнтау. Гэтым пытаннем займаюцца зараз кафедры універсітэта, дэканаты і рэктарат. Вядома, што на многіх факультэтах студэнты да гэтага часу вельмі перагружаны лекцыйнымі заняткамі. Для самастойнай работы амаль не застаецца часу. Зараз гэты недахоп будзе ліквідаваны. Зыходзячы з пастановы Міністэрства асветы Саюза ССР, у якой прапануецца максімальна зменшыць лік абавязковых аудыторных гадзін, рэктарат універсітэта рашыу увесці не больш шасці гадзін заняткау у дзень.

У інструкцыі Міністэрства асветы таксама указваецца на тое, каб не паутараць адны і тыя-ж тэмы у розных курсах, якія чытаюцца студэнтам.

У будучым лекцыі павінны будавацца на глыбока навуковай аснове, даваць напрамак у самастойнай рабоце студэнтаў.

Рэктарат універсітэта намеціу таксама рад мерапрыемствау па збліжэнню навукі з вытворчасцю.

САМІМ БРАЦЦА ЗА СПРАВУ

(З выступлення т. Салашэнкі, ст. гістфака)

Я хачу сказаць аб ролі грамадскіх арганізацый у жыцці студэнтау. Справа у тым, што па многіх пытаннях, якія павінны вырашаць самі студэнты, адміністрацыя прымае рашэнні, процілеглыя поглядам калектыву.

Прывяду прыклады. Студэнт Савіцкі неаднаразова быу затрыман міліцыяй у нецвярозым стане. Сход групы рашыу, што паводзіны Савіцкага ганьбяць курс і прасіу рэктарат выключыць яго з універсітэта. Але там рашылі не крыудзіць п'яніцу, далі яму магчымасць раней тэрміну здаць экзамены і перавесціся у іншую ВНУ. Другі прыклад. Нядаўна Г. А. Павецьеў падпісау праект стыпендыяльных камісіи, дзе гаворыцца, што усе пункты узгоднены з грамадскімі арганізацыямі. Аднак прафком і камітэт комсамола аб гэтым не ведаюць.

Дрэнна таксама, што размеркаваннем месц у інтэрнаце ведае адзін толькі Б. Н. Бярэзін.

Пара комсамольскім і профсаюзным арганізацыям браць справу у свае рукі, а не займацца толькі размеркаваннем газет.

Адбылася X комсамольская канферэнцыя БДУ. Быў заслухан і абмеркаван даклад сакратара камітэта ЛКСМБ універсітэта Е. Бабосава. У спрэчках выступіла 15 дэлегатаў. Яны ускрывалі памылкі і недахопы ў комсамольскай рабоце, унеслі свае канкрэтныя прапановы.

X комсамольская канферэнцыя універсітэта прайшла пад знакам вострай і прынцыповай крытыкі і самакрытыкі, пры высокай актыунасці дэлегатаў.

Ніжэй мы змяшчаем матэрыялы канферэнцыі.

Вучобу і дысцыпліну—у цэнтр увагі

(З даклада сакратара камітэта комсамола БДУ т. Бабосава)

Веліч стаячых перад намі задач, бурнае развіццё навукі, тэхнікі, культуры настойліва патрабуюць ад студэнцтва трывалых усебаковых ведау.

Вынікі экзаменацыйных сесій паказваюць, што асноуная маса студэнтау нашага універсітэта па-сур'езнаму адносіцца да вучобы. Комсамольцы, як правіла, з'яўляюцца прыкладам у вучобе і дысцыпліне. Мы ганарымся такімі выдатнікамі, як Хоміч, Шацернік (геолага-геаграфічны факультэт), Марук і Хатока (хімічны факультэт), Ціток (гістарычны факультэт), Цярпігор'ева і Пятровіч (фізмат), Галкоуская (біяфак), Серафімовіч (юрыдычны факультэт), Кліменценка і Мацкевіч (філалагічны факультэт), і многімі другімі. Выдатную паспяховасць яны спалучаюць з актыуным удзелам у грамадскай рабоце.

Аднак у нашай рабоце ёсць многа недахопау. У нас ёсць яшчэ студэнты, якія дрэнна наведваюць лекцыі і семінарскія заняткі, не вядуць канспектау. Гэта гаворыць аб тым, што пярвічныя комсамольскія арганізацыі слаба яшчэ вядуць барацьбу з парушальнікамі вучэбнай дысцыпліны, абыякава праходзяць міма фактау недобрасумленнай падрыхтоукі студэнтау да семінарскіх і практычных заняткау, мала цікавяцца тым, як займаюцца комсамольцы на працягу усяго семестра. Найбольшая колькасць непаспяваючых прыпадае на першыя курсы. Гэта сведчыць аб тым, што комсамольскія арганізацыі факультэтау мала увагі удзяляюць першакурснікам, не дапамагаюць ім.

Вялікае значэнне у падрыхтоуцы высокакваліфікаваных спецыялістау мае навукова-даследчая работа. Тут комсамольская арганізацыя універсітэта разам з советамі СНТ дабілася значных поспехау. У 52-х навуковых гуртках працавала звыш дзевяцісот студэнтау. 202 лепшыя студэнцкія навукова-даследчыя работы былі прадстаулены на сёмы гарадскі агляд студэнцкіх навуковых работ.

Аднак і у гэтым пытанні маецца рад істотных недахопау. Перш за усё неабходна адзначыць, што каля двух трэціх колькасці нашых студэнтау зусім не удзельнічае у рабоце навукова-даследчых гурткоу. На працягу амаль усяго года бяздзейнічау гурток пры кафедры марксізма-ленінізма.

Многа недахопау маецца і у ідэйна-выхаваучай рабоце, у якой віднае месца павінны займаць лекцыі і даклады па пытаннях навукі, тэхнікі, мастацтва і г. д. На вялікі жаль, такіх лекцый і дакладау прачытана у нас вельмі мала. Слаба працавала лектарская група. Важнай формай выхаваучай работы сярод студэнтау з'яуляюцца палітгурткі і палітінфармацыі. Гэтыя мерапрыемствы нядрэнна праводзіліся на хімічным факультэце. Там агляды друку чаргаваліся з іншымі мерапрыемствамі: са звесткамі аб навінках навукі і тэхнікі, аглядамі навуковых часопісау, з навінамі мастацтва і г. д. Аднак у цэлым па універсітэту у правядзенні палітінфармацый яшчэ многа фармалізму. На многіх курсах яны праводзяцца сумна, нецікава.

Горача адгукнуліся нашы комсамольцы на зварот ЦК ВЛКСМ аб дапамозе новасёлам ва уборцы ураджаю на цалінных землях. Каля 300 комсамольцау універсітэта выказалі жаданне ехаць на цалінныя землі Казахстана. Не на словах, а на справе там, у далёкім Казахстане яны паказалі прыклад самаадданай працы.

Неабходнай састауной часткай комуністычнага выхавання моладзі з'яуляецца культурна-масавая работа, якая развівае мастацкія густы, узбагачае духоуны свет чалавека. У асноуным уся работа калектывау мастацкай самадзейнасці на факультэтах праводзілася у плане падрыхтоукі да універсітэцкага агляду.

Не усё добра у нас і з шэфскай работай. Тут можна толькі адзначыць старанную работу—шэфства над дзіцячым домам № 8. Комсамольцы аддзялення журналістыкі многа зрабілі для сваіх маленькіх сяброу.

Студэнтам—політэхнічныя веды

(З выступлення т. Цярпігор'евай, студэнткі аддз. фізікі)

У школах рэспублікі вядзецца барацьба за політэхнічнае навучанне моладзі. Гэта значыць, што мы, студэнты фізмата, пасля заканчэння універсітэта будзем пастаулены перад неабходнасцю кіраваць мноствам самых рознастайных гурткоў. Але перш чым кіраваць, патрэбна самім многае ведаць. Не цяжка уявіць, як будзе адчуваць сябе выкладчык, які ніколі у жыцці не падыходзіў да станка, калі яму прапануюць паказаць навучэнцам працэс апрацоўкі той або іншай дэталі.

У нас ёсць усе магчымасці атрымаць глыбокія і трывалыя веды. Пры універсітэце маецца механічная майстэрня, але студэнты не ведаюць туды дарогу. Тлумачыцца гэта тым, што памяшканне майстэрні малое. Нашым кіраунікам патрэона было-б падумаць аб яго расшырэнні або наладзіць наведванне майстэрні невялікімі групамі па 6—8 чалавек.

На фізмаце можна і неабходна арганізаваць радыёгурток. Спецыялісты у нас ёсць, жадаючых займацца таксама больш чым дастаткова, дэталі можна ўзяць на радыёзаводзе. Студэнты некалькі разоу звярталіся за дапамогай у дэканат, хадзілі да тав. Павецьева, але і да гэтага часу гурток не працуе.

Нездавальняюча абстаіць справа і з фотагуртком, у які запісалася 180 чалавек. Такая маса фотааматарау абслугоуваецца толькі двума выкладчыкамі.

Большасць студэнтаў не ўмее вадзіць аўтамабіль, трактар, матацыкл. Створаныя гурткі аута-і мотааматарау не здольны ахапіць усіх студэнтау. А чалавек, які атрымлівае вышэйшую адукацыю, павінен валодаць тэхнікай. Нельга мірыцца з тым, што у нас глядзяць на справу аутаваджэння, як на выключную заслугу адзінак.

Патрэбна, каб дэканат фізіка-матэматычнага факультэта больш сур'ёзна аднёсся да выхавання будучых педагогаў, наладзіў справу так, каб нашы выпускнікі не былі бездапаможнымі у практычнай дзейнасці.

БЛІЖЭЙ ДА ЖЫЦЦЯ!

(З выступлення т. Клімава, студэнта філфака)

Калі гаварыць аб сувязі навукі з вытворчасцю, тэорыі з практыкай, то патрэбна зауважыць, што студэнты-філолагі найбольш адарваны ад жыцця, ад педагагічнай дзейнасці. Толькі тады мы будзем смела уступаць у самастойнае жыццё, калі нашы тэарэтычныя веды будуць добра замацаваны на практыцы. У нас-жа, філолагау, практычная работа пачынаецца толькі на чацвертым курсе, ды і то у канцы года. Мне думаецца, што філолагі павінны больш грунтоуна знаёміцца з педагагічнай дзейнасцю, набываючы не толькі тэарэтычныя веды, але і практычныя.

Аб вучобе комсамольскага актыву

(З выступлення т. Круглова, студэнта філфака)

...Многія комсамольскія актывісты універсітэта дрэнна ведаюць формы і метады комсамольскай работы. Як правесці тое або іншае мерапрыемства, як падрыхтаваць сход або вырашыць якое-небудзь іншае пытанне—над гэтым часта даводзіцца задумвацца комсамольскім кіраунікам.

Вучоба комсамольскага актыву павінна быць пярвейшым абавязкам камітэта комсамола, а таксама гаркома. На вялікі жаль, гарком комсамола дрэнна займаецца гэтым важным пытаннем. У мінулым годзе, напрыклад, быў арганізаван толькі адзін семінар сакратароу комсамольскіх арганізацый. Але і той адбыуся перад заканчэннем навучальнага года. Ды і што гэта быу за семінар!? Выступалі на ім па загадзя падрыхтаваных шпаргалках. Карысці ад такога семінара не вельмі многа.

Навукова-даследчая работа павінна быць творчай

(З выступлення т. Лукашэвіча, фізмат)

Навукова-даследчая работа на фізіка-матэматычным факультэце пастаўлена дрэнна. На агульнагарадскі агляд студэнцкіх навуковых работ ад нас былі накіраваны працы толькі чатырох студэнтаў—лепшыя дыпломныя і курсавыя работы. А што рабілі гурткоўцы? Чаму студэнты, якія спачатку актыўна ўдзельнічалі у рабоце навукова-даследчых гурткоу, адыйшлі ад гэтай справы?

На мой погляд, у гэтым вінаваты не толькі студэнты, але і выкладчыкі, якія абавязаны былі кіраваць навукова-даследчай работай у гуртках. Замест правядзення цікавай даследчай работы у гуртках яны чыталі лекцыі, што фактычна з'яулялася працягам акадэмічных заняткаў. Студэнты не маглі праявіць сябе творча. Тэмы для дакладау браліся з кніжак. Варта было прачытаць надрукаванае, і пытанне станавілася зразумелым. А хіба цікава даследаваць даследаванае?

З рашэнняў канферэнцыі

*** Камітэту комсамола сістэматычна праводзіць работу з комсамольскім актывам.**

*** Членам камітэта ўдзельнічаць асабіста у правядзенні курсавых і факультэцкіх мерапрыемстваў.**

*** Сістэматычна ўдзельнічаць у падрыхтоўцы матэрыялаў для універсітэцкага друку.**

*** Практыкаваць правядзенне сумесных культурна-масавых палітыка-выхаваучых мерапрыемстваў паміж рознымі факультэтамі універсітэта.**

*** Комсамольская канферэнцыя патрабуе ад комсамольцаў лічыць сваім абавязкам правядзенне штодзённай, рашучай барацьбы з парушальнікамі грамадскага парадку не толькі сярод студэнтау універсітэта, але і сярод моладзі горада.**

Універсітэцкі ВОЖЫК на КОМСАМОЛЬСКАЙ канферэнцыі



У лабараторыях хімічнага факультэта вельмі часта не працуюць выцяжныя шафы, таму даводзіцца працаваць у процівагазах.



Даваліся словы, сцвярджаліся словы,
Што хутка ўсе будзе, як трэба, у нас.
На справе-ж і сёння такія умовы,
Што трэба заусёды насіць супрацьгаз.

Загадка

На 5-ым курсе біяфака справаздачна-выбарны комсамольскі сход прайшоу за 30 мінут. Паспрабуйце здагадацца, як умудрылася бюро курса зрабіць гэта?

За ўвесь час свайго існавання СНТ БДУ быў выдадзены толькі адзін друкаваны зборнік студэнцкіх навуковых работ.

Крычалі у СНТ «ура!»
І кніжку ускідвалі высока...
Ды толькі гэтая пара—
«Паданне старыны далёкай».

Застылы гурток

Створаны пры кафедры марксізма-ленінізма студэнцкі навуковы гурток за цэлы год не правёў ніводнага пасяджэння.

У гурткі пазапісалі.
Планау добрых сотню склалі,
Улілі у іх шмат вады—
І ні туды, і ні сюды.

Адказныя задачы выдавецтва

Рэдакцыйна-выдавецкі совет універсітэта абмеркаваў даклад галоунага рэдактара выдавецтва ЕДУ А. Волка аб выкананні выдавецкага плана за 1956 год. Вынікі работы выдавецтва за 9 месяцаў бягучага года выражаюцца у выпуску 17 назваў з 23 запланаваных, або 212 друкаваных аркушаў з 280 па плану. Тав. Волк запэўніў, што па колькасці назваў і па лістажу план будзе выканан. Аднак нерытмічная работа факультэцкіх рэдкалегій і недастатковае пачуццё адказнасці асобных аутараў вядзе да затрымкі раду выданняў (С. В. Калішэвіч, М. М. Паулючэнка, І. Н. Сержанін і некаторыя другія).

У застаушыяся месяцы будзе выдадзена тры тамы навуковых запісак, некалькі брашур і лекцый (прафесараў І. В. Гутарава, Н. Ф. Ермоленкі, дацэнта А. С. Баркана), а таксама зборнік, прысвечаны II навукова-метадычнай канферэнцыі. Пры падрыхтоўцы яго выявіліся многія недахопы як у змесце, так і у падрыхтоўцы да друку тэзісаў работ, якія адлюстроуваюць навукова-метадычную творчасць асобных кафедр і работнікаў. Было вырашана ускласці агульнае навуковае рэдагаванне прац навукова-метадычнай канферэнцыі на загадчыка кафедры педагогікі універсітэта Л. В. Шашкова.

Рэдакцыйна-выдавецкі совет не абмежаваўся абмеркаваннем таго, як ажыццяўляецца выдавецкі план 1956 года, але і выказаў рад прынцыпова важных рэкамендацый адносна планавання і ажыццяўлення кафедрамі і факультэтамі іх работ на 1957 год.

Работа вышэйшай школы заўсёды знаходзіцца у самым цесным кантакце з развіццём навукі, а своечасовае выданне навуковых прац найбольш спрыяльна адбіваецца на даследчай рабоце. У адпаведнасці з новым палажэннем аб атэстацыі і аб падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў усё большую ролю адыгрывае своечасовае апублікаванне навуковых прац.

У абмеркаванні перспектыў навуковых выданняў БДУ прынялі удзел прафесары І. В. Гутараў, Н. Ф. Ермоленка, І. Н. Лушчыцкі, Д. Супрунецка, дацэнты Г. А. Павецьеу, О. Н. Андрушчанка, Д. Е. Фактаровіч. Падводзячы вынікі спрэчак, старшыня рэдакцыйна-выдавецкага совета, рэктар універсітэта прафесар К. І. Лукашоў вызначыў важнейшыя задачы выдавецтва на бліжэйшы час. Ён сказаў, у прыватнасці, што неабходна не толькі дабівацца безумоўнай дакладнасці у выкананні тэрмінаў праходжання работ па інстанцыях, але і палепшыць іх апрабацыю на кафедрах і рэдкалегіях факультэтаў. За якасць работ пры калектыуным іх абмеркаванні павінны несці адказнасць аутары і рэдактары, рэдкалегіі факультэтаў, якія неабходна узмацніць. Трэба практыкаваць пасылку манаграфічных работ на водзыў вядомым спецыялістам краіны.

У планавых выпусках навуковых запісак неабходна арганізаваць аддзел кароткіх паведамленняў, які дасць магчымасць сцісла, але своечасова інфармаваць грамадскасць аб тым, што распрацоўваецца нашымі вучонымі. Манаграфічныя і доктарскія работы надрэнна было-б выдаваць у «Працах».

Советы факультэтаў павінны з усёй строгасцю падыйсці да захавання устаноўленага аб'ёму кніг, без перавышэння норм лістажу. Трэба імкнуцца да падрыхтоўкі тэматычных зборнікаў, якія хутчэй знаходзяць сабе дарогу да чытача.

Справа гонару кафедр і факультэтаў—выявіць усе резервы для апублікавання сур'ёзных работ у самы бліжэйшы час. Гэта прадэманструе перад шырокай навуковай грамадскасцю поспехі нашага калектыву.

З ДЗЁННІКА ПРАКТЫКАНТА

1-га ліпеня. Ледзь адшукаў рэдакцыю. Пастукаўшы, з трапятаннем пераступіў запаветны парог.

— Добры дзень.

— Угу,—буркнуу у адказ мужчына у гімнасцёрцы з шырокім армейскім поясам і лысінай, якая магла-б упрыгожыць любы рэдактарскі кабінет.—Пачакаице крыху.

Я згарнуу свае паперы у трубку, прысеу на канапу і стаў чакаць. Мужчына з лысінай (пазней я даведаўся, што гэта быу рэдактар Воранау) праверыў надрукаванае машыністкай і, нарэшце, звярнууся да мяне:

— Ну, што вы нам прынеслі?

— Мяне накіравалі да вас на практыку.

— А-а. Вельмі прыемна, будзем працаваць.

Бліснула лысіна і схілілася над маімі паперамі, але не надоуга.

— Я іду да сябе,—сказау рэдактар машыністцы і знік.

— Куды гэта да сябе?—запытау я здзіулена.

— Вядома, у свой кабінет.

Але калі я праз некаторы час зайшоу у кабінет рэдактара, яго там не было. Я доуга чакау. Нарэшце, па парадзе машыністкі пайшоу дадому. Крыудна, калі пра цябе забываюць, як гэта зрабіу Воранау.

2-га ліпеня. Прысутнічау на свяце песні.

3-га ліпеня. Пісау інфармацыю. Рэдактар, здаецца, мяне запрыкмеціу, ды і то, напэуна, каб падагнаць: «Хутчэй, хутчэй пішы, браток!». Інфармацыя атрымалася, і я прынёс яе рэдактару.

— Вось так,—прабурчэу тварэц газеты, і вялікі кавалак майго твору быу перакрэслены адным махам. Ад такіх чулых адносін да маёй работы мне стала не па сабе. Я адышоу у куток, сеу на крэсла і моучкі пачау разглядаць трапіушы пад руку часопіс.

4-га ліпеня. Нумар газеты выйшаў. Сваю інфармацыю пазнаў, дзякуючы подпісу унізе. Работы сёння няма ніякай. Усе туляюцца без справы, адлучаюцца на гадзіну-другую. Пасля абеда свабодны—рэдактар адпусціў. А шкада—прапау дзень.

5-га ліпеня. Зноу без работы. Дзякуй сакратару—дау апрацаваць пісьмо селькора. Я накінууся на яго як галодны на хлеб.

6-га ліпеня. Правіў карэктуру. Рэдактар маю праўку нават не ўлічваў. Хоць-бы для выгляду зверыуся, а то быццам не зауважаў мяне.

8-га ліпеня .Работы няма. Папрасіуся у калгас. Рэдактар пабяцаў даставіць на матацыкле у сельгасарцель «Маяк».

— Пачакаи толькі, пакуль грязь падсохне,—сказаў ён мне.

— Што-ж, пачакаю.

9-га ліпеня. Сяджу, чакаю. Не выцыцё—малина, а калі раскусіш—ои, як горка.! Праз сцяну чуваць, як рэдактар па тэлефоне пытае старшыню нейкага калгаса аб ходзе сіласавання. Просіць назваць пару прозвішчаў. «Для нас,—кажа ён,—галоунае людзі».

10 ліпеня. Правіу карэктуру. Рэдактар і сакратар кудысьці паехалі.

— Ва ўсякім разе не ў калгас,—запэуніла машыністка.—Туды яны выязджаюць па аднаму і не так часта.

Памылак знайшоу многа. З'явіуся рэдактар, праверыу маю праўку. У выразе «матэрыял прападносіцца дрэнна» слова «прападносіцца» я змяніу на «падаецца». Але рэдактар зноў зрабіу па-старому. Я пачау даказваць, што такога слова няма у беларускай мове. Але куды там! Толькі з руска-беларускім слоунікам спрачацца не стаў, пераканауся, што па-беларуску трэба пісаць «падаецца». Калі-б не слоунік, мне-б не паверыў.

11-га ліпеня. Надакучыла чакаць, пакуль падсохне. Папрасіуся схадзіць у бліжэйшы калгас. Рэдактар згадзіуся. Нават заданне даў: напісаць аб сенаўборцы.

12-га ліпеня. Пісаў заметку. Зноу рэдактар правіу. Прауда, на гэты раз менш. Канцоуку ён даў сваю: «Члены сельгасарцелі не дапускаюць разрыву паміж касьбой і сушкай траў. Пачалося масавае стагаванне сена.

Прауленню калгаса неабходна ўзмацніць работы па касьбе сеяных траў і натуральных сенажацей, здачы сена дзяржаве».

Нешта падобнае да гэтага я сустракау, толькі, здаецца, гаварылася пра падрыхтоуку да сенаўборкі.

13-га ліпеня. Субота. Нумар выйшаў. Некалькі разоу пыталі па тэлефоне рэдактара. Сакратар адказваў: у камандыроуцы—і загадкава падміргваў машыністцы. Пасля абеда сакратар пайшоу з сваім сябрам—загадчыкам райфа. Вярнууся толькі к канцу рабочага дня. Напэуна, многа хадзіу і стаміуся, нябога, бо ногі у яго штосьці падкошваліся, а вочы ажно пачырванелі. Размаулялі. Да мяне дайшло: журналістам станеш толькі тады, калі, маючь адзін факцік, напішаш доугі артыкул. Няужо прауда?

22-га ліпеня. У 12 гадзін з'явілася начальства: спачатку сакратар, пасля—рэдактар. Неузабаве за імі прыйшоу загадчык аддзелам прапаганды і агітацыі Зарубін і адразу-ж заявіу:

— На злёце калгаснікаў-перадавікоў даярка Адамовіч не выступала. Яе выступленне, прауда, было запланавана, але яго адмянілі з-за недахопу часу. А у газеце нашай надрукавана, што Адамовіч выступіла з прамовай.

Воранаў доуга спрачауся з Зарубіным.

24-га ліпеня. Хутка канец маёй практыкі. А што зроблена? Адно пісьмо апрацавана і напісаны чатыры матэрыялы, ды і то майго там пасля праукі рэдактара нічога не засталося. Прызнаваць іх сваімі соромна.

31-га ліпеня. Апошні дзень практыкі. Неяк выпрасіу характарыстыку, не пісалі ніколі, «напішы сам, пячатку паставім».

Развіталіся без асаблівых цырымоній. Рэдактар раіу пераходзіць на другі факультэт. «Журналіст—гэта такая прафесія...»—і ен закончыў жэстам, моу, не варта і слоу траціць. Сакратар зноу закрануу сакрэт журналістыкі: «Іншы раз з пальца увесь нумар высасаць трэба»—пры гэтым ён выставіу указальны палец.

Добра яму з яго доугімі пальцамі, а што рабіць мне з маімі кароценькімі?

Пакідаючы рэдакцыю, я шчыра падзякаваў іх. За што? Вядома не за увагу да мяне і маёй практыкі. Проста за тое, што, дзякуючы ім, я зразумеу, якім не павінен быць журналіст.

МАР'ЯН ПАБОЙНЯ.

У НАС У ІНТЭРНАЦЕ

У рукі Нікалая Васілеускага трапіу свежы нумар часопіса «Маладая гвардыя» і зараз ён паглыбіуся у чытанне пісем М. Горкага да маладых пісьменнікаў

(Здымак 1).

Ларыса Кошкіна паспешліва заплятае касу: ёй трэба бегчы на рэпетыцыю хора.

(Здымак 2).

Смачны абед сёння у выпускніц філалагічнага факультэта.

(Здымак 3).

Фота. М. Пільшчыкава.

РОЗНЫ ЛЁС

Барыс і Віктар—антыподы: Віктар худы і доугі, Барыс—каржакаваты, каротканогі здаравяка; першы размауляе павольна, падбіраючы кожнае слова, другі-ж—захлёбваецца словамі, як той балабон. Ён належыць да катэгорыі людзей, якія лічаць філасофію зводам пустых і таямнічых загадак, але тым не менш любіць пафілософстваваць на любую тэму. Ён пусты не ад прыроды, а ад дрэннай звычкі хапаць веды не для узбагачэння свайго розуму, а для здзіуленя імі другіх. І раптам абодва антыподы рашылі запісацца у гурток па вывучэнню творчасці рускіх пісьменнікаў. Ну, Віктар зразумела, чаму: ён любіць літаратуру і, як усякі малады чалавек, марыць тайком стварыць нешта вялікае і арыгінальнае. А што прымусіла Барыса узяцца за даследчую работу?

— Што з'яуляецца галоуным у гуртку?—патэтычна пытауся ён у Віктара.—Масавасць. А хіба розныя рагаткі могуць забяспечыць масавасць? Не. Не кожны-ж здолее напісаць даследаванне...

Некалькі дзён пазней абодва студэнты праглядвалі тэматычны план, які быу прапанаван ім кіраўніком гуртка Нікалаем Аляксандравічам: «Мова Пушкіна», «Мова і стыль Пушкіна», «Мова і стыль Чэхава».

Барыс спыніу свой выбар на мове Чэхава. Віктар-жа доуга не мог згадзіцца, што гэта сапрауды тэмы гуртка. А калі яго пераканалі у гэтым, ён баязліва запратэставаў:

— Але... я хацеу-бы што-небудзь аб Буніне напісаць.

Нікалай Аляксандравіч даверліва палажыу руку на яго плячо.

— Будзем гаварыць шчыра: наш гурток павінен здаць на дарадскі агляд 10 работ. Не здадзім—з нас на вучоным совеце скуру здымуць. Вось чаму я і даю вам тэму палягчэй. А з Буніным наурад ці справіцеся вы да тэрміну.

Перад экзаменам Барыс прынёс Нікалаю Аляксандравічу плод сваіх творчых намаганняу, сціпла назваушы яго «чарнавым экземплярам работы». Ну і экземпляржа гэта быу! Узятыя напракат чужыя думкі мільгалі на агульным фоне, як каляровыя лапікі на гарнітуры клоуна. Супраць чакання пашывачны матэрыял угадвауся з першага погляду.

— Пасля экзамена я абавязкова займуся аддзелкай,—клятвенна запэуніу студэнт.—Зараз некалі. Я і так баюся, што правалю сесію: столькі часу ўбіу на даследаванне.

А потым Нікалай Аляксандравіч, скрыпнуушы «сэрцам» і пяром, напісау на работу Барыса і другіх членаў гуртка пахвальныя рэцэнзіі, бо ведаў, што добрая рэцэнзія—гэта накшталт пропуска на агляд. Калі яшчэ спахвацяцца, што выдан ён незаслужана!

Закончыушы рэцэнзіі, Нікалай Аляксандравіч, праскрыпеушы ужо толькі пяром, напісаў справаздачу аб рабоце кіруемага ім гуртка: займалася у ім дзесяць чалавек, пяць з іх напісалі навукова-даследчыя работы, якія прадстаулены на агляд.

Засталося толькі сказаць, што Віктар атрымаў вымову, а Барыс аказауся намнога празорлівым, чым ён думаў: за актыуны удзел у навукова-даследчых гуртках... яго прэміравалі (?!). Па заканчэнню універсітэта ён чакаў выдатнай характарыстыкі і рэкамендацыі у аспірантуру.

Як бачыце, розныя людзі Віктар і Барыс, розны у іх лес.

Няхай не абвінавачваюць нас у тым, што мы назвалі выдуманыя прозвішчы Віктара, Барыса і іх кіраўніка: справа не у канкрэтных прозвішчах, а у агульнай пастаноуцы работы навуковых гурткоу. Падобныя гісторыі кожны год адбываюцца ва універсітэце. Ужо колькі разоу сцвярджалі, што навукова-даследчую работу ва універсітэце трэба перабудаваць, але справа ад размоу, нават самых палкіх і шчырых, не змянілася ні на сінь порах. Тэмы даследчых работ адарваны ад жыцця. На фізіка-матэматычным факультэце студэнтам проста даюць раздзел падручніка, які яны добрасумленна вывучаюць спачатку у гуртку, а затым на лекцыях. Тэмы «палягчэй» робяць са студэнтаў у лепшым выпадку кампелятараў, а бывае і так, што некаторыя без усялякага сораму падпісваюць свае прозвішчы пад чужымі працамі.

Няужо кіраўнікі не разумеюць шкоднасці такой дзейнасці? Разумеюць, але не шукаюць лепшых метадаў працы таму, што мэта навукова-даследчага гуртка зрабіць столькі работ, колькі іх патрэбна прадставіць на гадскі агляд студэнцкіх работ. Толькі колькасць. Гэта дае магчымасць казыраць перад іншымі ВНУ: мы вось дзвесце работ прадставілі, а вы што?

На наш погляд, трэба было-б узнавіць статут СНТ і выпрабавальныя умовы. Няхай у гуртку будзе менш людзей, але толькі тыя, якія сапрауды жадаюць займацца, а не тыя «празорлівыя», што ідуць у гурток для палягчэння свайго лесу на экзаменах ды дзеля характарыстык з адзнакай пры заканчэнні універсітэта. Лепш менш, ды лепш. Кожны гурток, кожная кафедра універсітэта можа узяць для навуковага даследавання якую-не будзь актуальную тэму, прыцягнуць студэнтау для яе распрацоукі. Няхай студэнт зробіць невялікую частку работы, але яна будзе неабходна у агульнай працы. Такая калектыуная праца узбагаціць навуку і прынясе задавальненне удзельнікам гуртка.

Зразумела, вышэй сказаным нельга перакрэсліць усю навукова-даследчую работу універсітэта. Ёсць поспехі: аб іх ужо «на тысячу ладоу» расказалі на шматлікіх сходах, канферэнцыях. А вось аб дрэнным кіраўніцтве СНТ імкнуцца змаучаць, але не з пачуцця сціпласці, а ад нежадання «выносіць смецце з хаты». Калі яны шчыра жадаюць ажыццявіць навукова-даследчую работу, то перш за усё павінны вытрахнуць гэтае смецце.

А. ГЕРУС.



Падарожжа вакол Еўропы

((Працяг, пачатак у № 23, 24, 25)

Наш цеплаход ля берагоў Італіі, тут мы знаёмімся з Неапалем. Размешчаны на беразе мора ля ног гаманлівага Везувія, ён бліжыць агнямі, якія адлюстроўваюцца у вадзе.

Азнаёміушыся са славутасцямі горада, набыушы сувеніры, турысты спецыяльным поездам паехалі у Рым. На вакзале у Неапалі да нас падыходзілі італьянцы. Мы дарылі ім значкі і адкрытки. Але раптам яны разбеглія—гэта з'явілія палцэйскія. Як толькі палцэйскія зніклі, італьянцы падбеглі пад вокны нашых вагонаў, ветліва усміхаліся нам, дарылі свае адкрыткі і манеткі.

Дарога у Рым была незвычаина цікавай. Навокал рассцілаліся то рауніны, засаджаныя вінаградам, які віуся вакол ствалоу дрэу, кукурузай, канопляміі іншымі раслінамі, то горы, пакрытыя садамі і лясамі. Па дарогах павольна цягнулися маленькія цялежкі. Поезд пралятаў адзін паустанак за другім, імчауся праз шматлікія тунелі і, нарэшце, спыніуся на адным з вакзалаў.

Мы зноў у аутобусах, знаемімся з італьянскай сталіцай. Перш за усё нас павезлі у Вацікан, гэтую апору імперыялістычнай рэакцыі і цемрашальства. Тут сабраны вялікія багацці. У адным з залаў знаходзіцца зроблены з золата макет храма, вагой у 15 кілограмаў, вялікія залатыя падсвечнікі, крыжы, біблі. Сцены тут размалявалі лепшыя мастакі часоу Адраджэння, як Мікеланджэла і іншыя. Цікавая дэталь: у зале, дзе выбіраецца папа, нельга знаходзіцца без галаунога убора і у сукенцы з кароткімі рукавамі. Ля варот стаяць швейцарскія салдаты, у старадаунія паласатых нацыянальных касцюмах. Непрыемна было глядзець на тое, што папы Вацікана, якія спалілі на кастры Д. Бруно, праследавалі і перадавалі інквізіцыі перадавых вучоных, цяпер не супраць выкарыстаць дасягненні навукі і тэхнікі. Так, у Вацікане уз вышаюцца радыёмачты, усюды гарыць электрычнае святло, ёсць тэлевізары.

Агледзелі мы і сабор св. Пятра, дзе усё прыстасавана для таго, каб як мага больш прыцягнуць веруючых. Нас здзівіла тое, што на статуі св. Пятра, змешчанай ля адной сцяны сабора, злізан вялік палец нагі. Наш экскурсавод растлумачыу, што гэта веруючыя, цалуючы нагу, злізалі яго.

А вось Калізей у Рыме знаходзіцца у запушчаным выглядзе, старадаунія помнікі архітэктуры захоуваюцца нядбайна.

У наступныя дні турысты наведалі старажытны горад Пампею, Сарэнта і вострау Капры. Пампея, засыпаная калісці попелам Везувія, зараз амаль поунасцю раскопана. Перад вачыма турыстаў прадстаў старажытны горад. У музеях Пампеі захоуваюцца прадметы быту, медыцынскія інструменты і г. д. Сам горад быу калісці строга распланаваны, маставыя укладзены у асноуным плітамі, вуліцы вузкія, але вымашчаныя.

Знаходзячыся у Італіі, мы з хваляваннем чакалі паездкі на востраў Капры, бо там некаторы час жыу А. М. Горкі, туды да яго прыязджаў В. І. Ленін.

І вось мы на Капры. Але нам і не думалі паказваць дом, дзе жыу вялікі пісьменнік. На наша пытанне экскурсавод адказау, што ён сам добра не ведае, дзе жыу Горкі, а потым паказау на адзін з чырвоных домікаў над абрывам. Мы звярнуліся да рыбакоу. Адзін з іх, пакрыты сівізной, пачуушы імя Горкага, усміхнууся і паказау нам зусім у другі бок.

Мы яшчэ доуга блукалі сярод вузкіх перавулкау Капры, і, нарэшце, прыйшлі на месца. Гаспадыня дома сустрэла нас ветліва, павяла на другі павєрх, паказала пакой, дзе жыу Горкі. Мы бясконца былі удзячны ёй. Нас толькі пакрыудзіла, што на гэтым доме няма нават мемарыяльнай дошкі, але у памяці народнай Горкі не памёр.

У час паездкі нам неаднаразова рыходзілася бачыць абыякавыя адносіны правячых колау да народных талентаў. У Заходняй Еуропе вандруючыя спевакі і музыканты—частая з'ява. Тысячы іх бадзяюцца па дарогах Еуропы, шукаючы сабе харч.

Асабліва запалі у памяці спевы маладой італьянскай дзяучыны у адным з рэстаранаў сялення Амальфі, якое размешчана у маляунічым кутку Італіі на беразе мора.

У час нашага абеду у залу увайшла прыгожая дзяучына у супразаджэнні акампаніятара. Яна нясмела стала ля сцяны залы і яшчэ больш нясмела пачала спяваць. Яе голас нам вельмі спадабауся, хаця мы і не ведалі слоу гэтай песенкі. Потым яна праспявала усім вядомую песню «Санта Лючыя». Але больш, чым песні, на нас зрабіла уражанне іх выканауца. Калі дзяучына скончыла спяваць і пачула з нашага боку апладысменты, яна вельмі узрадавалася і пачала абходзіць сталы, працягваючы сваю карзіначку для падавання. Потым яна шчыра падзякавала нас. Дзяучына і яе кампаньён пакінулі у нас пачуццё жалю за лёс гэтых і ім падобных людзей.

НА ЗДЫМКУ: плошча у Рыме.

А. С. ЛАКІЗА,
кандыдат філасофскіх навук.
(Працяг будзе).

—Дзядзенька, а у іх рукі калі-небудзь вырастуць?
—Не ведаю. Спытай у дзядулі Бярэзіна.
Фота П. БЕРАЖКОВА.



НА КОНКУРС

ВЫПРАБАВАННЕ МУЖНАСЦІ

(Нарыс)

Амаль поўны дзень пырскаў дробны, халодны дождж, над стэпам стагналі і лёталі вятры, кроплі дажджу сцябалі па твару. А пад вечар усё суціхла. Толькі вецер нешта таямнічае мармытаў у каласах пшаніцы. Скрозь шматкі хмар зірнуў маладзік. А дзесьці далёка-далёка за гарызонтам час ад часу успыхвалі рубінавым бляскам трапяткія зарніцы.

Ціха у палатцы. Усе спяць. Усе, акрамя адной дзяучыны. Яна аблакацілася на маленькі чамаданчык і задумённа пазірае некуды у куток. Раз-по раз у палатку урываецца вецер. Агарак свечкі тады пачынае трапятацца.

Учора Ніна Кошкіна атрымала пісьмо ад брата, у якім той цікавіцца яе жыццём, работай на цалінных землях Казахстана.

Аб чым напісаць? Хочацца расказаць аб самым галоўным, важным. Але што галоўнае? Хіба пачаць з таго памятнага комсамольскага сходу?

Успомніуся пагодлівы чэрвеньскі дзень. Студэнты III курса біёлага-глебавага факультэта БДУ абмяркоувалі Зварот ЦК ВЛКСМ аб дапамозе новасельцам цаліны ўбраць багаты ураджай.

— Так,— задумённа вымавіла Іда Качура.—Паглядзець-бы на гэтыя цалінныя земл. Там, відаць, вельмі прыгожа...

— Вядомая справа,—падхапіла Таня Цюлькіна, член комсамольскага бюро факультэта.—Я была там, у Кустанайскай вобласці,— удакладніла яна.—Выйдзеш, бывала, вясною у стэп: травы па самыя грудзі; калышуцца, а з іх, нібы самацветы, імкнуць да сонца рознакаляровыя кветкі. Прыгажосць! А стэп роуны-роуны і маляунічы, як любоуна вышыты абрус.

— Рамантыка!—выдыхнуў нехта.

— Рамантыка будзе потым,— пачууся у адказ голас Нікалая Геся.—Перш за усё там працаваць трэба. І працаваць па-сапраўднаму, па-комсамольску. Чаго-ж доуга думаць?-працягваў ён, грохі памаучаушы, — нас кліча комсамол—значыць, мы там патрэбны. Давайце пісаць заявы—і у дарогу!

Такі рэзкі паварот справы азадачыу некаторых. Нязведаныя раней пачуцці напоўнілі сэрцы студэнтаў. Было крыху страшнавата, але і спакуслива. Што чакае іх—гэтых яшчэ толькі учора выпырхнуўшых з-пад бацькоускага крыла дзевятнаццацігадовых юнакоу і дзяучат—там, далёка, за пяць тысяч кілометраў ад роднай Беларусі? Цяжка было адказаць. Таму і вагаліся: ехаць або не ехаць?

— Хлопцам яшчэ нічога,—прамовіла Галя Галкоуская.—А вось, як нам, дзяучатам? Цяжка будзе...

— Невядомасць палохае, — уздыхнула Ніна Кошкіна. І увесь выгляд дзяучыны: трывожна пырхаючыя бровы, і позірк, пільны, заклапочаны, і пальцы, нервова выстукваючыя па сталу—усё гаварыла аб тым, што у сэрцы дзяучыны праходзіць барацьба. — Аднак ехаць трэба! — рашуча сказала яна, ускінуушы чорныя бровы.

— Няхай дурні едуць,—пачулася аднекуль з кутка.

Тады узняуся Еугеній Бабосау.

— Тут нехта рэпліку кінуу, мауляў, няхай дурні едуць. Але хто-ж гэта сказаў? Ну хто, таварышы? Баяцца-ж нечага.—Еугеніи абвёў усіх позіркам. У зале стаяла цішыня.— Вось бачыце,—працягваў Бабосаў,—крыкнуў і схаваўся за спінамі таварышаў. Пабаяўся прызнацца. А баязліуцы нам не патрэбны. Мы іх не пусцім з сабой. Ці так?—звярнууся ён да аудыторыі.

— Правільна!—пачулася ў адказ. І гэта наукол цаліна?—здзіулена спытала Ніна.—А я уяуляла, што тут кавыль ды травы.

— Цаліны ужо няма тут,—усміхнуюся брыгадзір.—Яе вясной узнялі. А зараз тут пшаніца без канца і краю.

А праз некалькі мінут механізатары ужо вялі студэнтаў у сталоуку, дзе для іх было прыгатавана смачнае снеданне. Калі хлопцы і дзяучаты падсілкаваліся, яны пайшлі аглядаць майстэрні, інтэрнат, палаткі.

— Брыгада наша комсамольска-маладзёжная, — растлумачыу студэнтам Уладзімір Іванавіч.— Хваліцца не думаю, але скажу прама, што па усіх відах палявых работ трымаем першынство у раёне. Спадзяемся, што і зараз не падкачаем. Убраць мы павінны ляць тысяч гектараў пшаніцы. Жніво мы распачалі яшчэ учора у выбарачным парадку. Вынікі нядрэнныя—па 15—18 цэнтнераў з гектара. Сёння вы яшчэ адпачывайце, уладжвайце справу з жыллём,—працягваў ён,—а заутра на досвітку—за справу!

На другі дзень, ледзь толькі заружавеу усход, адзін за другім паплылі камбайны на свае загоны. Нецярплівыя шафёры, не жадаючы чакаць каля палаток, павялі машыны уздагон за камбайнамі. Паехалі з імі і студэнты.

— Што мы будзем рабіць?— пацікавіуся кіраўнік групы Нікалай Гесь.

— Хлопцы будуць разгружаць зерне, а дзяучатам дадзім работу каля гэй,—адказаў загадчык токам Казімір Тамашуніс.

— А мы не жадаем, дзе лягэй, — запратэставалі дзяучаты. Асабліва гарачылася Іра Саладоўнікава:

— Што мы, горш за хлопцаў? Зось паглядзіце, якія у Ніны мускулы. А яна у нас самая маленькая.

— Няхай хлопцы ідуць перакідаць, а мы будзем разгружаць машыны,—падтрымала сяброуку Іра Качура.—Яшчэ паглядзім, хто будзе лепш працаваць!

Э. ЧЭЧКО.
(Працяг у наступным нумары).

Каз.—Хто баіцца, таму не месца з намі.

Адзін за другім юнакі і дзяучаты падаюць заявы...

— «Едзем на цаліну»—толькі аб гэтым і гаварылі ў тыя дні ва універсітэце.

Нарэшце настау доугачаканы дзень ад'езду. Апошні гудок паравоза, поціскі рук. І як толькі поезд крануусяз месца, сама сабой узнікла мужная, велічная мелодыя:

«До свиданья, мама, не горюй,
На прощанье сына поцелуй!
До свиданья, мама, не горюй,
не грусти!
Пожелай нам доброго пути!»

Эшалон імчыцца, развяваючы клубамі дыму, нібы грывай. Колы адстукваюць доугія кілометры. Побач мільгаюць гарады і вёскі, лясы, пералескі, хмызнякі. Вось далёка ззаду засталася велічная Волга з чырвонымі, сінімі, зялёнымі агеньчыкамі бакенаў на яе сераватай ад ранішняга туману паверхні. За акном вагонаў праплылі непаўторныя у сваёй суровай прыгажосці гранітныя гмахі старажытных Уральскіх гор; мінавалі і каменную вяху, на адным баку якой напісана «Еуропа», а на другім—«Азія». А раніцой шостага дня перад намі раскінууся неаглядны, без адзінага ўзгорачка або дрэуца, казахстанскі стэп.

...Набіраючы хуткасць, грузавік імчыць па палявой дарозе, уздымаючы за сабой густыя слупы пылу. А наукол, наколькі ахоплівае вока, стэп пераліваецца залатымі хвалямі пшаніцы.

Наперадзе паказаліся палаткі, нізкія саманныя домікі, а побач з імі вялізныя, адліваючыя серабром, цыстэрны з гаручым. Крыху паводдаль выстраіліся у рад новенькія камбайны, грузавікі, трактары. Тут размяшчаецца другая брыгада зернесоўгаса імя Горкага.

Да машыны, якая прывезла студэнтаў, падышоу дзябёлы, невысокага росту мужчына сярэдніх год. На ім блакітная майка і замшальваная кепка, насунутая на калматыя чорныя бровы, якія сутыкаюцца ля пераносіцы.

— Дабро пажаловаць,— ветліва звярнуўся ён да гасцей.—Будзем знаёміцца. Алейнік, Уладзімір Іванавіч. Працую брыгадзірам,—адрэкамендаваўся ён першым, паціскаючы рукі студэнтам.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Пры кафедры англійскай мовы арганізуюцца гурткі па перакладу навукова-тэхнічнай літаратуры з англійскай на рускую мову і мастацкай—з англійскай на беларускую.

Запіс праводзіцца ў кабінеце замежнай мовы (біялагічны корпус, аудыторыя № 51) да 25 лістапада гэтага года.

Кафедра англійскай мовы.

Рэдактар А. ВОЛК.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, пакой 62, тэл. 2-07-19

АТ 10902 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 1251 Тыраж 2000